ВІРЛІВАЙ ЭКАНОМІКІ

«Мы можам ГЭТА!»
Пасля перамогі на спартыўных спаборніцтвах.

Прадстаўляем калектыў

Біяграфія цэнтра цесна пераплятаецца з важнейшымі этапамі развіцця эканомікі Брэстчыны і бярэ свой пачатак у 1939 годзе са стварэння паверачнага органа.

Пасля Вялікай Айчыннай зноў давялося пачынаць з нуля і паступова пашыраць тэхнічныя магчымасці. Спачатку гэта была паверка прасцейшых прыбораў.

З цягам часу ўдасканальвалася абласная метралагічная служба, пашыраліся вобласці вымярэнняў і наменклатура павяраемых мер і сродкаў вымярэнняў. У 1950-я ствараецца абласная лабараторыя дзяржнагляду за стандартамі і вымяральнай тэхнікай (ЛДН). На яе аснове развіваюцца і работы па стандартызацыі.

Кардынальныя перамены адбыліся ў 1976 годзе, калі ЛДН атрымлівае новы двухпавярховы будынак на прыгарадным вакзале. На той жа час прыходзяцца і прыкметныя якасныя перамены ў калектыве, які папоўніўся выпускнікамі спецыялізаваных аддзяленняў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў СССР.

А метралагічная служба аснашчаецца сучаснай эталоннай базай, неабходнай для забеспячэння дакладнасці вымярэнняў на буйных прамысловых прадпрыемствах саюзнага значэння.

У 1980-я гады адкрываюцца цэнтр выпрабаванняў сельскагаспадарчай прадукцыі і паверачная лабараторыя па дазіметрыі і радыяметрыі.

У 1987 годзе ЛДН перайменавана ў РУП «Брэсцкі ЦСМ», а з 2001 года ў РУП «Брэсцкі ЦСМС» (Цэнтр стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі). З гэтага часу пачынаецца навейшая гісторыя калектыву, які за 75 гадоў змог ператварыць невялікі паверачны орган у сучаснае дзяржаўнае прадпрыемства, што карыстаецца заслужаным аўтарытэтам не толькі на Брэстчыне.

У калектыве налічваецца 180 чалавек, большасць з іх — з вышэйшай адукацыяй.

І атамны спектрометр у дапамогу

Пра работу аднаго з вядучых падраздзяленняў цэнтра — выпрабавальнай лабараторыі — раскажам вуснамі яе работнікаў. Суправаджае нас начальнік лабараторыі Святлана СІВАЧЭНКА.

— Вось тут ідзе рэгістрацыя ўзораў і прысваенне кадзіраваных шыфраў, — Святлана Аляксандраўна ставіць нас нібы ў самы пачатак даволі вялікага вытворчага канвеера. — Кожная проба мае індывідуальны шыфр, які не паўтараецца на працягу года. Рэгістрацыя вядзецца ў электронным выглядзе. І наогул уся працэдура, у тым ліку афармленне пратаколаў выпрабаванняў, аўтаматызавана.

— Ужо падчас прыёму проб выконваюцца патрабаванні стандартаў. Напрыклад, калі парушаны ўмовы дастаўкі ці ўпакоўкі, проба хутчэй за ўсё, прынятай не будзе, — тлумачыць вядучы інжынер Ірына Чывілёва, якая занята прыёмкай. — Бо любая проба павінна быць цалкам ідэнтычнай сваёй групе прадукцыі (тавараў), і гэта аксіёма. Толькі што я прыняла на выпрабаванне кансервы стэрылізаваныя вытворчасці Бярозаўскага мясакамбіната. На маім этапе праверкі іх прадукцыя заўсёды адпавядае патрабаванням стандартаў на адбор проб, і я пасля шыфравання перадаю яе на пробападрыхтоўку.

Інжынер Марына БАНТЫШ вызначае наяўнасць таксічных элементаў метадам атамна-абсарбцыйнай спектраметрыі.

— А гэта, — вядзе далей экскурс Святлана Аляксандраўна, — група спецыяльных метадаў выпрабаванняў. Тут з дапамогай сучаснага атамнага абсарбцыйнага спектрометра вызначаецца наяўнасць ці адсутнасць таксічных элементаў. Вымярэнні, апрацоўку і разлікі вядзе камп'ютар па спецыяльнай праграме, памылкі быць не можа, «чалавечы фактар» адсутнічае.

— Для праверкі на сваім ААС «Спектр АА 220» метадам кіслотнай мінералізацыі мы падрыхтавалі пробы каўбас, масла і сыру, — уступае ў размову інжынер 1-й катэгорыі Наталля Міхайлоўская. — Гэты метад, як і метад сухога азалення, надзвычай інфарматыўны.

Наталля ўключае выцяжку, пачынаецца працэс праверкі, а мы пераходзім у лабараторыю радыёметрычных выпрабаванняў, дзе гаспадарыць вядучы інжынер Ірына Міхнюк.

— У асноўным на праверку паступаюць харчовая прадукцыя і «дары лесу» — грыбы, ягады. На маёй памяці, колькі працую,— сведчыць наша суразмоўца, — забруджанай прадукцыі не было. Тое ж магу сказаць пра малако, бульбу і іншае.

У суседнім пакоі, таксама начыненым разнастайным абсталяваннем, размясцілася група храматаграфічных метадаў выпрабаванняў. Тут тлумачэнні дае інжынер 2-й катэгорыі Яўгенія Ганчарук.

— Праводзяцца выпрабаванні на газавых і вадкасных храматографах і метадам танкаслойнай храматаграфіі. У прыватнасці, вызначаем наяўнасць пестыцыдаў, сінтэтычных фарбавальнікаў, кансервантаў, арганічных кіслот, недапушчальныя прымесі ў каньяках і гарэлцы. Можам таксама вызначаць кафеін і падсалоджвальнікі ў безалкагольных напоях — пералік вялікі.

Яўгенія закончыла Беларускі тэхналагічны ўніверсітэт, прыехала сюды па размеркаванні. Працуе трэці год, кажа, што падабаецца. Значыць, гартуецца, набывае вопыт змена.

У групе фізіка-хімічных метадаў выпрабаванняў дзяўчаты заняты вызначэннем масавай долі тлушчаў і вільгаці ў прадуктах. Вядучы інжынер Аксана Сафарава рэзюмуе: — Да каўбас, сыроў і іншай прадукцыі па нашых паказчыках прэтэнзій не маем, прадукцыя якасная.

Калег падтрымлівае і група мікрабіялагічных метадаў даследаванняў, размешчаная па суседстве:

— Мікрабіялагічныя паказчыкі бяспекі прадукцыі звычайна ў норме. Мы кантралюем і наяўнасць генетычна мадыфікаваных арганізмаў (ГМА), — распавядае вядучы інжынер Ірына Дзмітрук. — Калі ў 2005 годзе аднымі з першых у Беларусі пачалі гэтым займацца, то выяўлялі ГМА ў імпартных прадуктах даволі часта, да 30 працэнтаў ад усіх праверак. Як і соевыя дабаўкі. Зараз гэтага няма, распужалі патэнцыйных парушальнікаў, — смяецца Ірына Васільеўна. — Ведаюць, што не прапусцім. Сёлета не выяўлена ніводнага выпадку.

Кіраўнік лабараторыі дадае:

— Выпрабавальная лабараторыя акрэдытавана ў Нацыянальнай сістэме і ў сістэме акрэдытацыі Расійскай Федэрацыі, уключана ў Адзіны рэестр органаў па сертыфікацыі і выпрабавальных лабараторый (цэнтраў) Мытнага саюза. Маем права выдачы экспартнага сертыфіката на сельскагаспадарчую прадукцыю, якая пастаўляецца ў ЕС.

— Няўжо жывецца без праблем, Святлана Аляксандраўна?

— Калі параўнальна нядаўна на тэрыторыі Мытнага саюза ўвялі абавязковыя патрабаванні да прадукцыі лёгкай прамысловасці (гэта Тэхнічны Рэгламент 017), выявілася, што ў рэгіёне недастатковая выпрабавальная база. У сувязі з гэтым праводзяцца работы па аснашчэнні лабараторыі дадатковым абсталяваннем. Асвойваем методыкі вызначэння паказчыкаў бяспекі і якасці тэкстыльных, швейных і трыкатажных вырабаў, абутку, футраў і скур.

Невычэрпная крыніца

Увядзенне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, Мытнага саюза, а таксама Еўразійскага эканамічнага саюза, у краінах — гандлёвых партнёрах прадпрыемстваў Брэстчыны вялікай колькасці тэхнічных нормаў абавязвае ЦСМС заўсёды быць у курсе гэтых перамен і своечасова даводзіць інфармацыю аб іх да зацікаўленых спецыялістаў.

Брэсцкі ЦСМС мае велізарны фонд дакументацыі, які налічвае больш за 30 тысяч адзінак. Тут таксама можна атрымаць інфармацыю аб усіх дакументах Нацыянальнага фонду тэхнічных нарматыўных прававых актаў. Гэта не толькі непасрэдна рэгламенты, кодэксы і стандарты, але і разнастайная метадычная літаратура, каталогі, зборнікі публікацый, перыёдыка і іншае.

Цэнтр, які з'яўляецца сучаснай аўтаматызаванай вытворчасцю з буйным паркам вылічальнай тэхнікі, аб'яднанай у размеркаваную на тры будынкі вылічальную сетку з магутнымі серверамі, мае тэхнічныя магчымасці і спецыялістаў, здольных аказаць кваліфікаваную дапамогу ў гэтым зменлівым інфармацыйным патоку.

Тут створаны і базы даных па кірунках уласнай вытворчай дзейнасці.

Новыя віды паслуг

Пачынаючы з 2011 года цэнтр аказвае паслугі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, у тым ліку дапамагае распрацоўваць экалагічныя пашпарты прадпрыемстваў, сістэмы кіравання навакольным асяроддзем.

Праводзяцца работы па атэстацыі рабочых месцаў па ўмовах працы. Створаны новы аддзел, які ажыццяўляе выпрабаванні і вымярэнні электрычных параметраў, даследаванні фактараў вытворчага асяроддзя і іншае.

А кантроль якасці будаўніча-мантажных работ — гэта ўклад калектыву цэнтра ў рашэнне важнай дзяржаўнай задачы — паляпшэння якасці будаўніцтва. Адно з апошніх нововядзенняў — стварэнне лабараторыі па выпрабаванні сродкаў індывідуальнай абароны і ручнога інструменту ад паражэння электрычным токам.

На базе прадпрыемства «Эталон», што далучылася да цэнтра, створаны цэнтр па рамонце і тэхнічным абслугоўванні сродкаў вымярэнняў і абсталявання (ЦРТО «Эталон»). Ён займаецца таксама тэхнічным абслугоўваннем касавых падсумоўваючых апаратаў і спецыяльных камп'ютарных сістэм. А таксама пастаўкай і продажам вялікага спектра вымяральнага абсталявання, касавых апаратаў.

Пад асаблівым кантролем...

Самая шматлікая ў цэнтры — метралагічная служба. Гэта практычна трэць калектыву. Яна прадстаўлена адразу чатырма самастойнымі аддзеламі, што працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі і ўзброены ўнікальнымі комплексамі эталоннай апаратуры. Скажам, пад асаблівым кантролем — забеспячэнне рашэнняў дзяржаўных заданняў па энерга- і рэсурсазберажэнні. Праводзіцца метралагічная атэстацыя аўтаматызаваных сістэм кантролю і ўліку электраэнергіі (АСКУЭ).

Начальнік аднаго з аддзелаў Людміла Маніла адпрацавала ў цэнтры 38 гадоў, і калегі сведчаць, што лепшага спецыяліста ў метралогіі таго кірунку, які яна вядзе, няма ва ўсёй рэспубліцы.

— Асноўная задача, якую мы вырашаем, — забеспячэнне адзінства вымярэнняў на тэрыторыі вобласці. Да сваёй работы падыходзім з пункту гледжання таго, наколькі забяспечваем запатрабаванні прадпрыемстваў, — дзеліцца Людміла Андрэеўна. — Эталоны, з якімі мы працуем, самыя сучасныя. Вось просты прыклад. На такіх нашых перадавых прадпрыемствах, як «Брэстгазаапарат», «Гефест Кварц», «Савушкін прадукт», «Санта Брэмар» для вытворчасці прадукцыі выкарыстоўваецца цалкам сучаснае абсталяванне, і ў яго саставе эксплуатуюцца таксама сучасныя сродкі вымярэнняў. І ўжо адно тое, што мы маем магчымасць павяраць іх, не вывозячы за межы вобласці, сведчыць, што наша эталонная і тэхнічная база, наш інтэлектуальны патэнцыял адпавядаюць задачам, якія перад намі пастаўлены.

Побач з традыцыйнымі ёсць віды работ, якія ў рэспубліцы выконваем толькі мы. Напрыклад, наша служба займаецца каліброўкай тэрмахронных датчыкаў-накапляльнікаў тэмпературы, якія выкарыстоўваюцца пры экспедзіраванні рэфрыжэратарамі харчовай прадукцыі на вялікія адлегласці. Іх тэрмаграмы, прачытаныя на камп'ютары, пацвярджаюць, што на працягу ўсяго шляху вытрымлівалася патрэбная тэмпература. А гэта важная інфармацыя для атрымальніка грузаў.

Гэтыя прыборы з поспехам выкарыстоўваюцца для рэгістрацыі тэмпературы і пры захоўванні сыравіны і гатовай прадукцыі на прадпрыемствах-вытворцах, у гандлі, на буйных складах, экспедытарскіх службах. І таму нашымі паслугамі карыстаюцца не толькі Брэсцкая, але і Мінская, і Гродзенская вобласці.

Займаемся атэстацыяй выпрабавальнага абсталявання, якое прымяняецца ў акрэдытаваных лабараторыях. Таксама — пярвічнай паверкай новых газавых лічыльнікаў, у тым ліку ўльтрагукавых, новых электрычных сродкаў вымярэнняў, якія выпускаюць мясцовыя прадпрыемствы. Яны трапляюць за межы прадпрыемстваў толькі пасля таго, як мы даём гарантыю, што іх паказчыкі адпавядаюць усім патрабаванням.

Публікацыю падрыхтаваў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.
УНП 200127048. **Здымкі прадастаўлены ЦСМС.**

Павярыцель
Наталля РАДЫВАНЮК.